АХОВА ПАД ЗНАКАМ САВЫ
№ 10 (14)
СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



**„...КОЖНАГА СУПРАЦОЎНІКА ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ ВЫЗНАЧАЕ ПАЧУЦЦЁ АБАВЯЗКУ І АДКАЗНАСЦІ, МУЖНАСЦЬ І БЯССТРАШНАСЦЬ, ВЫДАТНАЯ ФІЗІЧНАЯ ФОРМА І ЎМЕННЕ ХУТКА АРЫЕНТАВАЦЦА Ў САМАЙ НЕПРАДКАЗАЛЬНАЙ СІТУАЦЫІ"**

**„МЫ МОЖАМ ГАНАРЫЦЦА ТЫМ, ШТО СЛУЖБА АХОВЫ СЁННЯ АСАЦЫЮЕЦЦА З ТАКІМІ ДАСЯГНЕННЯМІ ЯК РЭАЛЬНАЯ І ЯКАСНАЯ АХОВА ГРАМАДЗЯН, ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАВЫ АД МНОГІХ І МНОГІХ НЕГАТЫЎНЫХ ПРАЯЎ. НАШ ДЭПАРТАМЕНТ СЛУЖЫЦЬ ТРЫВАЛЫМ ФУНДАМЕНТАМ УМАЦАВАННЯ ЗАКОННАСЦІ І ПРАВАПАРАДКУ"**

# СЁННЯ СУПРАЦОЎНІКІ І ВЕТЭРАНЫ ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АДЗНАЧАЮЦЬ ЧАРГОВУЮ ГАДАВІНУ З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ. ВІНШУЕМ З ГЭТАЙ ПАДЗЕЯЙ РАБОТНІКАЎ МІЛІЦЫІ І ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ СУМЛЕННА СЛУЖАЦЬ ПАД ЗНАКАМ САВЫ!

## НЕ ПАМЫЛІЎСЯ Ў ВЫБАРЫ ПРАФЕСІІ

**Адным з самых вартых прадстаўнікоў аховы Брэсцкай вобласці з'яўляецца міліцыянер-вадзіцель аператыўна-дзяжурнай службы Маскоўскага (г. Брэста) аддзела прапаршчык міліцыі Уладзімір Максімук.**

Уладзімір у падраздзяленні служыць з 1995 года. У 90-х гадах маладому хлопцу, які працаваў у будаўнічым трэсце № 8, відаць, наканавана было выбраць прафесію міліцыянера. З самага лепшага боку ён праявіў сябе яшчэ ў рабочым атрадзе садзейнічання міліцыі, а затым ахвотна прыняў прапанову ўступіць у яе рады.

Рамантычныя настроі Уладзіміра зніклі, як толькі ён пачаў выкананне службовых абавязкаў у новай якасці. Адно з першых дзяжурстваў у раёне Партызанскага праспекта завяршылася затрыманнем злачынцы. Невядомы сарваў з дзяўчыны залатыя ўпрыгажэнні і кінуўся ўцякаць. Рабаўніку, магчыма, удалося б згубіцца сярод мінакоў, калі б не ўменне хутка цяміць Уладзіміра Максімука. Менавіта ён «вылічыў» і затрымаў рабаўніка.

Самым сур'ёзным выпрабаваннем за гады службы прапаршчыка Максімука, па яго ацэнцы, стала затрыманне трох злачынцаў, якія ўчынілі забойства мужчыны на аўтобусным прыпынку. Ім не ўдалося пазбегнуць адказнасці за злачынства.

У рабоце аператыўна-дзяжурнай службы аддзела ёсць свае асаблівасці і тонкасці. Уладзімір набываў і «шліфаваў» навыкі, прайшоўшы за 15 гадоў шлях ад памочніка камандзіра ўзвода да камандзіра аддзялення. Прапаршчык неаднаразова быў адзначаны кіраўніцтвам аддзела, абласнога ўпраўлення і Дэпартамента аховы. У актыве ўзнагарод Уладзіміра — нагрудны знак «За адзнаку», медаль «90 гадоў міліцыі», шэраг іншых заахвочванняў. Ён з'яўляецца выдатнікам міліцыі і настаўнікам. Пад яго чуйным кіраўніцтвам вопыт у міліцэйскай справе набылі многія супрацоўнікі аддзела. А сёння і сын Уладзіміра вучыцца ў Акадэміі МУС. Відаць, прыклад бацькі аказаў вялікі ўплыў на выбар прафесіі Максімука-малодшага. Чамусьці не ўзнікае сумненняў, што праз некалькі гадоў сям'я Максімукоў стане вартай міліцэйскай дынастыяй.



## Паважаныя супрацоўнікі і ветэраны Дэпартамента аховы!



**Ад імя кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў віншую вас з 58-й гадавінай утварэння службы аховы!**

Сёння выкананне многіх і многіх задач, якія стаяць перад праваахоўным ведамствам, проста немагчымае без Дэпартамента аховы — па-сапраўднаму моцнага і мабільнага падраздзялення. Гэта калектыў надзейных і прафесійных салдат правапарадку, якія кругласутачна знаходзяцца на пярэднім краі супрацьстаяння злачыннасці ў самых розных формах яе праяўлення, ад злачынстваў маёмаснага характару да фактаў гвалту над асобай і пагроз жыццю і здароўю нашых грамадзян.

Асабовы склад дэпартамента забяспечвае надзейную ахову кватэр нашых грамадзян, іх маёмасці, ахоўвае дзяржаўныя і сацыяльныя аб'екты, стрымлівае і прадухіляе беззаконне, вяртае дзяржаве і ўладальнікам усіх формаў уласнасці немалыя сумы. Неадкладна рэагуючы на сігналы аб злачынствах і здарэннях, супрацоўнікі аховы затрымліваюць злачынцаў, забяспечваюць належны грамадскі парадак. Без сумнення, вы сёння запатрабаваныя грамадствам і патрэбныя людзям. Пра гэта сведчыць і давер грамадзян, якія, нягледзячы на эканамічныя і іншыя цяжкасці, па-ранейшаму бачаць у вас гарантаў бяспекі асобы і захаванасці матэрыяльнага дабрабыту. Упэўнена магу сказаць, што кожнага супрацоўніка Дэпартамента аховы вызначае пачуццё абавязку і адказнасці, мужнасць і бясстрашнасць, выдатная фізічная форма і ўменне хутка арыентавацца ў самай непрадказальнай сітуацыі.

Вы пастаянна ўдасканальваецеся ў прафесійным плане, распрацоўваеце новаўвядзенні тактыкі і стратэгіі супрацьдзеяння крыміналу, укараняеце ўнікальныя тэхнічныя сродкі, пашыраеце сферы дзейнасці. Вамі рухае шчырае жаданне зрабіць жыццё грамадзян спакойным і бяспечным, унесці пасільную лепту ў тое, каб дзяржава адчула сябе здаровай ва ўсіх сферах, моцнай і квітнеючай. Вам ёсць чым ганарыцца!

Жадаю асабоваму складу Дэпартамента аховы прафесійных поспехаў, сілы і мужнасці пры выкананні службовага абавязку. Здароўя, удачы і дабрабыту вам, а таксама вашым родным і блізкім. Дзякуй за ваша годнае стаўленне да высакароднай справы!

**Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь генерал-маёр міліцыі А.Н. КУЛЯШОЎ.**

## Паважаныя калегі!



За 58 гадоў свайго існавання наша служба прайшла няпросты, але годны і слаўны шлях. Сёння Дэпартамент аховы ўяўляе сабой дастаткова важнае падраздзяленне ў сістэме Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Кіраўніцтвам краіны нам даручана выкананне складаных і адказных задач у супрацьстаянні злачыннасці пры замаху на дзяржаўную ўласнасць. А грамадзяне краіны нам давяраюць захаванасць сваіх матэрыяльных даброт і, без перабольшвання, свае жыцці. Наш шматлікі калектыў, які складаецца з прадстаўнікоў многіх спецыяльнасцяў, з гонарам выконвае гэтую няпростую работу. Мы можам ганарыцца тым, што служба аховы сёння асацыюецца з такімі дасягненнямі як рэальная і якасная ахова грамадзян, грамадства і дзяржавы ад многіх і многіх негатыўных праяў. Наш дэпартамент служыць трывалым фундаментам умацавання законнасці і правапарадку.

Усе нашы поспехі і дасягненні — гэта вынік самаадданага і прафесійнага стаўлення да даручанай справы кожнага афіцэра, супрацоўніка, служачага, на якой бы пасадзе ён не знаходзіўся. Кожны з вас аддана служыць сваёй краіне і народу і тым самым уносіць значны ўклад у агульную для ўсіх нас справу ўмацавання бяспекі і захавання законных правоў і інтарэсаў грамадзян.

Асаблівыя словы падзякі хачу выказаць ветэранам службы аховы, якія прысвяцілі сваё жыццё такой важнай і патрэбнай прафесіі. Мы цэнім ваш вопыт у справе супрацьдзеяння злачыннасці, унёсак у выхаванне і станаўленне маладога пакалення супрацоўнікаў, з удзячнасцю пераймаем у вас традыцыі высакароднай справы!

Я шчыра ўпэўнены, што з такім цудоўным калектывам аднадумцаў і пры падтрымцы старэйшых пакаленняў вартавых парадку мы з гонарам і якасна выканаем усе задачы, якія стаяць перад намі.

Жадаю вам, паважаныя калегі, заўсёды захоўваць бадзёрасць духу, міліцэйскую кемлівасць і веру ў справядлівасць! Дабра і міру вам, вашым родным і блізкім!

**Начальнік Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь палкоўнік міліцыі С.А. БУЙНОЎСКІ.**

## ПРЫВЫК ПРАЦАВАЦЬ АД ДУШЫ

**Іван Арсеньевіч Каратай ужо больш за дзесяць гадоў на заслужаным адпачынку і... працуе ахоўнікам Навагрудскага аддзела аховы. Яго сённяшняе месца працы — ААТ «Навагрудскі масларобны камбінат». Іван Арсеньевіч да даручанага ўчастка працы ставіцца сумленна і годна. Пільны ахоўнік асабіста прадухіліў тры сур'ёзныя крадзяжы прадукцыі з прадпрыемства. Зрэшты, такім прынцыповым, уважлівым і цалкам адданым справе ён быў заўсёды.**

30 гадоў Каратай прысвяціў службе ў Навагрудскім райаддзеле міліцыі. Быў участковым інспектарам, на тэрыторыі Любчанскага сельсавета абслугоўваў 18 вёсак, уяўляючы для больш чым пяці тысяч вяскоўцаў усе органы ўнутраных спраў у сваёй асобе. Людзі паважалі свайго ўчастковага. Калі ў мэтах службовай неабходнасці Івана Каратая перавялі ў крымінальны вышук, а замест яго ў раён накіравалі іншага інспектара, мясцовыя жыхары звярнуліся з пісьмом да Міністра ўнутраных спраў з просьбай «вярнуць нашага ўчастковага», і іх пажаданні былі ўлічаныя. Каратай працаваў ад душы, з уласцівым яму тэмпераментам і воляй. Даражыў гонарам мундзіра і выконваў задачы дакладна і прафесійна. У працы часта праяўляў мужнасць, спрыт і прыродную



кемлівасць. У 1991 годзе Івану Арсеньевічу было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны ўчастковы інспектар БССР» з уручэннем пагонаў падпалкоўніка міліцыі. За шматгадовую бездакорную службу ў міліцыі Іван Каратай узнагароджаны 8 медалямі і нагруднымі знакамі МУС СССР і Рэспублікі Беларусь, а грамат і падзяк — проста не пералічыць.

Іван Арсеньевіч і сёння актывіст ва ўсім. Ён рэгулярна ўдзельнічае ў выхаванні маладога пакалення, аказвае садзейнічанне ў ахове грамадскага парадку, прапагандзе дзейнасці міліцыі, удзельнічае ў многіх значных мерапрыемствах, што праводзяцца Навагрудскім аддзелам аховы і РАУС. Ён перакананы, што якой бы складанай і напружанай ні была праца праваахоўнікаў, яна застаецца адной з самых ганаровых і запатрабаваных, паколькі няма працы больш высакароднай, чым служэнне свайму народу.

**Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Аляксандр ГЕРАСІМАЎ, Алена ЯРМАЛІНСКАЯ, Вольга КІПЧАНКА, Аксана САЛЯНЮК, Наталля ЛЕРНАТОВІЧ, Андрэй МАСЦЕРАЎ, Мікалай ЛОЙША, Аляксандр АКСЁНАЎ.**

## НАВАСЕЛЛЕ — СПРАВА СУР'ЁЗНАЯ

### Яно садзейнічае аўтарытэту службы

Якасці выканання службовых задач у немалой ступені садзейнічаюць умовы, у якіх працуе асабовы склад. Гэта разумее кіраўніцтва Дэпартамента аховы. Значныя сродкі і намаганні штогод накіроўваюцца на гэту сферу развіцця рэгіянальных падраздзяленняў. Сёлета адразу 2 аддзелы аховы Мінскай вобласці адсвяткавалі наваселле: камфартабельныя рабочыя месцы атрымалі супрацоўнікі ў Валожыне і Крупках.

2 сакавіка асабовы склад Валожынскага аддзялення пераехаў у новыя і ўтульныя кабінеты, якія размясціліся ў новым будынку мясцовага аддзялення сувязі. Падраздзяленню быў выдзелены цэлы паверх. Пераезд быў сапраўды доўгачаканым, паколькі з моманту свайго ўтварэння ў 1967 годзе калектыў туліўся ў будынку РАУС, займаючы каля 60 квадратных метраў плошчы. Выдзеленыя грашовыя сродкі дазволілі «засяліць» плошчу ў 340 квадратных метраў. Цяпер супрацоўнікі могуць цалкам аддацца выкананню службовых абавязкаў, не адцягваючыся на бытавыя праблемы. Начальнік Валожынскага аддзялення маёр Валерый Мамонька прыняў сімвалічны ключ ад будынка ва ўрачыстай абстаноўцы. Па добрай традыцыі, мясцовы настаяцель прачытаў малітву, а затым асвяціў рабочыя кабінеты, пажадаўшы асабоваму складу плённай працы на карысць людзей. Дарэчы, наваселле станоўча адбілася на выніках працы: за паўгода паказчыкі службовай дзейнасці ўзраслі ў разы.




Следам за калегамі эстафету пераналі ў Крупках. Гэтымі днямі адбылося адкрыццё новага будынка Крупскага аддзела аховы, які будаваўся каля двух гадоў. Да гэтага падраздзяленне размяшчалася ў пераабсталяванай барцоўскай зале мясцовага РАУС. Новы будынак адпавядае ўсім сучасным стандартам. Як адзначаюць у калектыве, нават немагчыма параўноўваць ранейшыя ўмовы з цяперашнімі. Сёння амаль у кожнага ёсць прасторны кабінет, абсталяваны сучаснай тэхнікай і камфартабельнай мэбляй. Не засталіся без увагі і «чатырохногія супрацоўнікі» — для службовых сабак абсталяваны персанальныя вальеры. Службовы транспарт «пераехаў» у новыя гаражы. Для прафесійнай падрыхтоўкі створаныя спецыяльныя класы, трэнажорная зала і душавыя.

Начальнік Крупскага аддзела аховы падпалкоўнік Мікалай Макарэвіч шчыра рады за свой калектыў. Бо супрацоўнікі працуюць непасрэдна з грамадзянамі і арганізацыямі, таму выдатная сучасная матэрыяльная база падраздзялення значна падымае аўтарытэт у вачах мясцовых жыхароў. Расце колькасць і эфектыўнасць працы асабовага складу.

Калектывы Валожынскага і Крупскага падраздзяленняў аховы са словамі ўдзячнасці звяртаюцца да кіраўніцтва дэпартамента за аказаную дапамогу ва ўзвядзенні будынкаў, стварэнне спрыяльных умоў працы, а таксама за разуменне ў вырашэнні нядаўніх праблем супрацоўнікаў.

## НОВЫЯ РУБЯЖЫ

### Ахова Фрунзенскага раёна сталіцы: цяпер 10 тысяч уладальнікаў кватэр могуць спаць спакойна

Фрунзенскі раён Мінска, без перабольшвання, з'яўляецца адным з самых напружаных у рэспубліцы ў плане аператыўнай абстаноўкі. Прыемна, што самі жыхары раёна цвяроза ацэньваюць сітуацыю і клапоцяцца пра захаванасць сваёй уласнасці. Калі ўсяго ў сталіцы пад апекай падраздзяленняў Дэпартамента аховы знаходзіцца 48 тысяч памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян, то пятая частка ад гэтай колькасці сканцэнтраваная ў Фрунзенскім раёне. Нядаўна быў заключаны юбілейны 10-тысячны дагавор на ахову кватэры. У сферы забеспячэння бяспекі жылля гэты паказчык — самы значны ў рэспубліцы. Для параўнання можна прывесці наступныя лічбы: у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях ахоўваецца 8,5 і 12 тысяч кватэр адпаведна. Нядаўна ва ўрачыстай абстаноўцы, у прысутнасці журналістаў рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, начальнік Фрунзенскага аддзела аховы падпалкоўнік міліцыі Уладзімір Валодзін уручыў юбілейнаму кліенту — Таццяне Клімянковай — кветкі і памятныя сувеніры **(на фота)**.

Фрунзенскаму аддзелу, якому летась споўнілася 50 гадоў, ёсць чым ганарыцца. З пачатку года нарады падраздзялення ажыццявілі больш за 20,5 тысячы экстранных выездаў, амаль 11,5 тысячы з іх — па сігнале «трывога», больш як 2 тысячы — на «спрацоўку» кнопак экстраннага выкліку міліцыі. Усе гэтыя паказчыкі — самыя значныя сярод іншых аддзелаў сталіцы. Як правіла, злачынцы стараюцца абыходзіць бокам аб'екты, якія знаходзяцца пад апекай падраздзяленняў аховы. Тым не менш, сёлета міліцыянерамі Фрунзенскага аддзела прадухілена 5 спробаў пранікнення на аб'екты, якія ахоўваюцца. Дарэчы, аб'ектаў, якія ўяўляюць асаблівую значнасць для сталіцы і нават краіны, на тэрыторыі раёна нямала. Напрыклад, у студзені ўведзены ў эксплуатацыю спартыўны комплекс «Мінск-Арэна», на працягу ўсяго перыяду будаўніцтва якога захаванасць будматэрыялаў і тэхнікі была забяспечана асабовым складам аддзела.



## МІЛІЦЫЯНЕР-КІНОЛАГ. ПАСАДА ЦІ ПРЫЗВАННЕ?

**Няпроста адказаць на гэта пытанне. У многіх з нас ёсць дамашнія гадаванцы. Нас прыцягвае іх адданасць. Па вечарах яны сваім цяплом, бурчаннем, пяшчотай супакойваюць нас пасля цяжкага працоўнага дня. А ў міліцыянера-кінолага не заўсёды ёсць час расслабіцца са сваім гадаванцам: трэніроўкі, харчаванне, служба ў гарачыню і ў сцюжу — той яшчэ графік!**

Службова-вышуковыя сабакі ў падраздзяленнях аховы выкарыстоўваюцца даўно. У 1986 годзе ў Полацку праходзілі рэспубліканскія спаборніцтвы міліцыянераў-кінолагаў. Тады службовыя сабакі туліліся ў цесных вальерах, выгульваліся на 100 квадратных метрах. У той час дрэсіроўкай, харчаваннем і выгулам сабак займаўся Аляксандр Ягоравіч Бурдэнка. Ён аддаў службе ў міліцыі больш за дваццаць гадоў і сёння з'яўляецца заслужаным ветэранам Полацкага аддзела аховы, працягваючы працаваць «па спецыяльнасці». Магчыма, яго цікавыя шматлікія расказы пра службовае сабакаводства сыгралі сваю ролю ў тым, што адзін з міліцыянераў-кіроўцаў аддзела перакваліфікаваўся ў міліцыянера-кінолага. Гаворка ідзе пра Аляксея Пятрова **(на фота — у цэнтры)**.

Ужо шэсць гадоў прапаршчык Пятроў прызнаецца лепшым міліцыянерам-кінолагам Полацкага аддзела аховы, бярэ ўдзел у многіх рэспубліканскіх спаборніцтвах. А з чаго ўсё пачыналася?

У 1998 годзе Аляксей уладкаваўся вартаўніком у Полацкі аддзел аховы, а праз два месяцы ён быў накіраваны ў вучэбны цэнтр аб'яднання «Ахова» пры МУС для праходжання першапачатковай падрыхтоўкі. Так пачалася міліцэйская служба.

6 гадоў Пятроў нёс службу ў групе затрымання ў якасці міліцыянера-кіроўцы. У аддзеле ўжо была наладжана кіналагічная служба. Быў пабудаваны новы гадавальнік службовага сабакаводства. У экіпажы Аляксея тры з лішнім гады быў і міліцыянер-кінолаг з службовым сабакам. Нарэшце Пятроў не вытрымаў і захацеў паспрабаваць сябе ў працы з чатырохногімі ахоўнікамі. Некамплект кінолагаў і сабак аказаўся «на руку». Аляксей узяў шчанюка нямецкай аўчаркі і пачаў спасцігаць азы выхавання. Каб праводзіць больш часу з Яўгенікай, прынёс сабаку дамоў. Жонка прыняла новага члена сям'і.

Быццам адчуваючы, што акружаная любоўю і клопатам, Яўгеніка стала паказваць свае самыя лепшыя якасці. У ліпені 2005 года яна стала прызёрам рэспубліканскай спецыялізаванай выставы сярод нямецкіх аўчарак. Следам атрымала яшчэ




некалькі прызавых месцаў на іншых выстаўках. К 2010 году Яўгеніка на міжрэгіянальных турнірах становіцца пераможцай за спартыўную і спецыяльную дрэсіроўку. Безумоўна, усе ўзнагароды Яўгенікі — гэта заслугі Аляксея. А разам яны — пастаянныя «зоркі» мясцовых СМІ і ўлюбёнцы дзяцей на розных мерапрыемствах.

За добрыя вынікі ў службе Аляксей быў прызначаны малодшым інспектарам-кінолагам і нёс службу сумесна з работнікамі Полацкага лясгаса па спыненні парушэнняў у сферы прыродаахоўнага заканадаўства. У 2008—2010 гадах ім асабіста было спынена мноства незаконных высечак лесу і яго крадзяжоў. Спынена 28 фактаў незаконнага палявання і рыбалоўства.

За ўвесь перыяд службы прапаршчыкам Пятровым затрымана нямала падазроных ва ўчыненні злачынстваў. А яго роля ў якасці міліцыянера-кінолага, які выязджае з службовым сабакам у складзе следча-аператыўнай групы аддзела міліцыі, часам і наогул неацэнная. Часта час, які праходзіць з моманту ўчынення крадзяжу да заявы пацярпелага, не дазваляе раскрыць злачынства па «гарачых слядах». Менавіта тут на дапамогу прыходзіць кінолаг з сабакам. Толькі за апошнія паўтара года Аляксей з Яўгенікай дапамаглі раскрыць 8 злачынстваў, расследаванню якіх нярэдка перашкаджалі дрэнныя ўмовы надвор'я.

На пытанне пра хобі Аляксей з усмешкай адказвае: «Яўгеніка — маё хобі, як і таварыш па службе». І сапраўды, за час свайго знаходжання на пасадзе, ён прывіў сабаку куды больш якасцяў і навыкаў, чым патрабуюць інструкцыі.

Сёння прапаршчык Пятроў — памочнік камандзіра ўзвода міліцыянераў-кінолагаў. Увесь вольны час ён праводзіць у гадавальніку службовага сабакаводства, дапамагаючы маладым кінолагам, увасабляючы варты прыклад для пераймання.

## ЧАЛАВЕК НА СВАІМ МЕСЦЫ

Ужо 18 гадоў міліцыянер-кіроўца групы затрымання Бабруйскага аддзела аховы прапаршчык Мікалай Міранóвіч аддады сваёй прафесіі. На яго погляд, чалавек павінен знайсці сваё месца ў жыцці, атрымліваць ад працы задавальненне і адчуваць сябе ўпэўнена.

На міліцыянера-кіроўцу ўскладаецца вялікая адказнасць у час нясення службы. Кіроўца заўсёды павінен быць сабраны, абавязаны выконваць правілы дарожнага руху, арыентавацца ў горадзе, ведаць размяшчэнне ахоўваемых аб'ектаў для правільнага і хуткага пад'езду да іх. Навыкі прафесійнага ваджэння дапамагаюць кваліфікавана ўдзельнічаць у аперацыях «Перахоп», за лічаныя хвіліны прыбываць на месца «спрацоўкі».

Спецыфіка службы ў міліцыі няпростая: ненармаваны працоўны дзень, начныя дзяжурствы, выклікі на здарэнні, звышурочная праца ў святы і выхадныя. Але ўсё гэта дапаўняе надзейны міліцэйскі тыл — сям'я. Заўсёды прыемна вяртацца дамоў, дзе чакаюць жонка і дзве дачкі, якія душы не чуюць у бацьку і заўсёды з нецярпеннем чакаюць.

Вольны час Мікалай Канстанцінавіч аддае сям'і. Але ёсць і хобі — рамонт аўтамабіляў. Так што, прафесію выбраў нездарма.

## ЭЛЕКТРАМАНЦЁРЫ З ГОМЕЛЯ — ЛЕПШЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

Сярод прадстаўнікоў розных прафесій і спецыяльнасцяў, якіх у Дэпартаменце аховы нямала, рэгулярна праводзяцца агляды-конкурсы прафмайстэрства. Мэта такіх мерапрыемстваў — павышэнне прафесіяналізму, абмен вопытам, выяўленне лепшых па прафесіі.

Нядаўна ў Гомелі завяршыўся 24-ы рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі на званне «Лепшы па прафесіі». Першыя месцы па ўсіх чатырох намінацыях занялі прадстаўнікі Гомельскага абласнога ўпраўлення дэпартамента. Конкурсы сярод электраманцёраў стымулююць творчы падыход у выкананні службовых абавязкаў работнікаў гэтай спецыяльнасці, развіваюць рацыяналізатарскія навыкі.

Першы этап конкурсу праводзіўся ў саміх рэгіянальных падраздзяленнях аховы сярод работнікаў, занятых абслугоўваннем сістэм сігналізацыі на аб'ектах і кватэрах грамадзян, электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі, асобаў, адказных за рамонт і наладку сістэм перадачы паведамленняў. Пераможцы І этапу ўзялі ўдзел у наступным конкурсе, які праводзіўся ўжо ў абласных і Мінскім гарадскім упраўленнях. На трэцім этапе конкурсу электраманцёры-пераможцы папярэдняга этапу сустрэліся на гомельскай зямлі.

Лепшых вызначалі ў трох «намінацыях». Сярод электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі па абслугоўванні сістэм сігналізацыі на аб'ектах і кватэрах грамадзян «Лепшым па прафесіі» ў асабістым заліку сталі прадстаўнікі каманды Гомельскага абласнога ўпраўлення аховы Павел Ярмоленка з Цэнтральнага (г. Гомеля) аддзела і Аляксей Гуцаў з Навабеліцкага (г. Гомеля) аддзела, 2-е месца занялі прадстаўнікі каманды Магілёўскага абласнога ўпраўлення, 3-е месца — за двума спецыялістамі з Мінска.

Сярод электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі па тэхнічным абслугоўванні і рамонце сродкаў перадачы паведамленняў першым стаў Аляксей Елкін з Чыгуначнага (г. Гомеля) аддзела, другім — кіраўнік каманды Віцебскага абласнога ўпраўлення, трэцім — прадстаўнік каманды Магілёўскага абласнога ўпраўлення.

«Лепшым па прафесіі» сярод электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі майстэрняў па рамонце тэхнічных сродкаў аховы былі прызнаны Уладзімір Карчэўскі з Гомельскага аблупраўлення, другім — электраманцёр з Магілёва, трэцім — з Віцебска.

У камандным заліку месцы размеркаваліся наступным чынам: «золата» — за камандай з Гомеля, «серабро» — за камандай з Магілёва і «бронза» — за мінчанамі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказнага за выпуск дадаткаў: «Чырвонай змены» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5274. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12